# ЭСКАДРЫЛЛЯ ШТУРМУЕ СЕШЧУ

**Сусько Якаў Ягоравіч нарадзіўся ў 1917 годзе ў сям'і селяніна вёскі Чарняўка Хоцімскага раёна. Скончыў у Ленінградзе школу ФЗН, затым працаваў кавалём на металічным заводзе і адначасова вучыўся на рабфаку. У 1937 годзе па камсамольскай пуцёўцы паступае ў Арэнбургскае авіяцыйнае вучылішча. З 1940 года — інструктар па навучанню курсантаў. З 1942 года — у дзеючай арміі, лётчык штурмавой авіяцыі. Звання Героя Савецкага Саюза ўдастоен Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 29 чэрвеня 1945 года.**

**Я. Я. Сусько ў 1946 годзе звольніўся з арміі. Скончыў педагагічны інстытут. Зараз жыве ў Маскве, працуе ў Міністэрстве замежных спраў СССР.**

Ворагу вельмі не спадабаўся наш «Ил-2». Вельмі змрочную назву яму прыдумаў: «Чорная смерць». А ў Якава Сусько была зусім іншая думка аб сваёй машыне. Нават пісьмо захапляючае паслаў ён стваральніку — Генеральнаму канструктару. Так, маўляў, і так, дарагі Сяргей Уладзіміравіч Ільюшын, штурмавік Вы прыдумалі цудоўны, мы з ім здорава папрацуем, фашыстаў гнаць будзем да самага Берліна...

А папрацаваць лётчыку Сусько і яго таварышам сапраўды давялося здорава. То быў май 1943 года, пярэдадзень вялікай бітвы на Курскай дузе. І пралогам яе было жорсткае адзінаборства ў небе. Адным з удзельнікаў гэтых бітваў быў Якаў Сусько. Днём і ноччу ўзлятаў у паветра яго «Ільюшын», паслухмяна лажыўся на курс, а потым брыючым палётам накідваўся на ворага. Не адна фашысцкая танкавая калона, вайсковы эшалон «ад работы» Сусько і яго эскадрыллі спынілі сваё існаванне, не заходзячы да лініі фронту. А ўжо «прапрацаваць» баявыя парадкі гітлераўцаў — на гэта нашы штурмавыя авіятары былі выдатныя майстры.

...Вечарам за Якава Сусько прыбег пасыльны:

— Да камандзіра палка!

На камандзірскім «КП» Сусько ўручылі карту раёна Сешча — буйнейшай базы фашысцкай бамбардзіровачнай авіяцыі на Курскім напрамку. Карта была дакладная. На ёй крыжыкамі былі адзначаны ангары, зенітныя батарэі, склады гаруча-змазачных матэрыялаў...

Адкуль даныя? У арміі не прынята задаваць такія пытанні. Толькі праз шмат год Якаў Ягоравіч даведаўся аб тым, што тут у Сешчы, дзейнічала інтэрнацыянальная антыфашысцкая арганізацыя супраціўлення. І крыжыкі на карце, несумненна, прыйшлі з-за лініі фронту. У тым, што ў Сешчы нашы сябры, Сусько пераканаўся ў тую ж ноч... У начной імгле раптам засвяціліся кішэнныя ліхтарыкі...

Стараліся падысці непрыкметна. Таму сямёрка «Ілаў-2» набрала вялікую вышыню і ўзяла курс некалькі на поўнач ад Сешчы. Вырашылі абагнуць раён аэрадрома і зайсці на яго потым з захаду. Падышлі непрыкметна. Ні адна зенітка не загаварыла, ні адзін пражэктар не засвяціў. Ля самага аэрадрома машына вядучага паслухмяна пайшла ўніз, адначасова з каманддзірам перайшла на піке ўся сямёрка. Удар быў моцны: 20 бамбардзіроўшчыкаў «Ю-87» былі знішчаны, узляцелі ў паветра рэзервуары з гаручым.

На другі дзень — паўторны курс на Сешчу. Паляцелі ўжо 24 «Ілы». Але на гэты раз фашысты чакалі візіту савецкай авіяцыі. Нашым «Ільюшыным» давялося прабірацца праз строй «мессершмітаў», суцэльны загараджальны зенітны агонь. Некаторая частка штурмавікоў вымушана была адцягнуць на сябе ўвагу знішчальнікаў, каб даць магчымасць астатнім скінуць на аэрадром бомбы.

Калі «Ілы-2» леглі на зваротны курс, на іх зноў накінуліся «месеры». Баявыя парадкі нашых самалётаў былі расстроены. І ім давялося весці бой у адзіночку або невялікімі групамі.

На самалёт Сусько насядалі два нямецкія знішчальнікі. Цяжка прыйшлося савецкаму лётчыку. Боекамплект скончыўся, страляць няма чым. А тут аднаму фашысту ўдалося з гармат і кулямётаў прашыць правае крыло. Самалёт стаў хіліцца ўправа. Якаву Ягоравічу з цяжкасцю ўдалося выраўняць машыну і зніжацца да брыючага палёту.

— Гітлеравец, бачачы маё незайздроснае становішча, — успамінае Сусько, — нават прыстроіўся побач і кулаком пагразіў мне. А я ў адказ яму кукіш паказаў...

Калі фашыст развярнуўся для атакі, Сусько ўбачыў прасеку (а ляцелі яны над Брянскім лесам), да не павёў машыну і знізіўся так, што ледзь не ўрэзаўся ў дрэвы. Атакі не паследавала. Так Сусько працягнуў 150 кіламетраў над акупіраванай фашыстамі тэрыторыяй і шчасліва сеў на свой аэрадром.

...113 баявых вылетаў здзейсніў лётчык штурмавой авіяцыі Якаў Сусько. На яго ратным шляху Курская дуга і Украіна, бітвы ў небе Польшчы і Венгрыі, Германіі і Чэхаславакіі. Бітва пад Сешчай — адзін з многіх эпізодаў цяжкага і слаўнага баявога жыцця камуніста Сусько.

Эскадрылля штурмуе Сешчу // Шлях Кастрычніка. — 1970. — 21 лютага. — С. 2.